Беларуская нацыянальная платформа
Форум грамадзянскай супольнасці
УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

Прынята Канферэнцыяй Беларускай нацыянальнай платформы
Форуму грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства
24 лютага 2018 г.

# РЭЗАЛЮЦЫЯ

## Канферэнцыі Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства

### Удзел грамадзян у працэсе прыняцця рашэнняў на мясцовым узроўні - важнае звяно станаўлення і развіцця мясцовага самакіравання ў Рэспубліцы Беларусь

Мы, удзельнікі Канферэнцыі Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства, кіруючыся інтарэсамі развіцця мясцовага самакіравання ў цэлым і формаў удзелу грамадзян у вырашэнні праблем на мясцовым узроўні - у прыватнасці, грунтуючыся на частцы 1 артыкула 3 і частцы 1 артыкула 5 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, імкнучыся да развіцця дыялогу і партнёрскіх адносін паміж мясцовымі органамі ўлады і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці і зыходзячы з назапашанага вопыту ўзаемадзеяння на мясцовым узроўні, звяртаемся да Палаты прадстаўнікоў і Савету Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, мясцовых Саветаў дэпутатаў і мясцовых выканаўчых камітэтаў з наступнымі прапановамі:

- актывізаваць інфармацыйна-асветніцкую дзейнасць, накіраваную на ўцягванне грамадзян у працэс прыняцця рашэнняў і рашэнне праблем на мясцовым узроўні, а таксама папулярызаваць прыклады лепшых практык грамадзянскага ўдзелу на мясцовым узроўні;

- садзейнічаць павышэнню дыялогавай культуры і стварэнню сумесных дыялогавых пляцовак для абмеркавання і вырашэння мясцовых праблем (арганізацыя рэгулярных сустрэч у мясцовых Саветах / выканкамах з прадстаўнікамі арганізацый грамадзянскай супольнасці, стварэнне сумесных экспертных Саветаў па актуальных праблемах і напрамках дзейнасці);

- імкнуцца да стварэння атмасферы даверу ў адносінах паміж арганізацыямі грамадзянскай супольнасці і мясцовымі органамі ўлады (сыход ад палітызацыі грамадскіх ініцыятыў, аказанне арганізацыйнага і адміністрацыйнага садзейнічання ў іх рэалізацыі, заахвочванне грамадскіх актывістаў і г.д.);

- забяспечыць рэалізацыю прынцыпу галоснасці і празрыстасці ў дзейнасці мясцовых органаў улады (заяўны прынцып наведвання мясцовых Саветаў дэпутатаў, свабодны доступ да інфармацыі, якая тычыцца законных правоў і інтарэсаў грамадзян, забеспячэнне права на атрыманне і распаўсюд інфармацыі аб дзейнасці мясцовых органаў улады, павышэнне інфарматыўнасці сайтаў мясцовых органаў улады і інш.);

- падрыхтаваць прапановы і юрыдычную базу для практычнага ўкаранення «бюджэту грамадзянскага ўдзелу» у мясцовыя бюджэты для фінансавання на конкурснай аснове грамадзянскіх ініцыятыў;
- падрыхтаваць прапановы па ўдасканаленні заканадаўства аб формах ўдзелу грамадзян у мясцовым самакіраванні (формах непасрэднай дэмакратыі) з мэтай іх дэбюракратызацыі і павышэння эфектыўнасці.

Беларуская нацыянальная платформа Форуму грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства і яе арганізацыі-ўдзельніцы гатовыя да актыўнага ўдзелу ў распрацоўцы і ўкараненні дадзеных прапаноў у практыку сумесна з цэнтральнымі і мясцовымі органамі ўлады і кіравання, а таксама з міжнароднымі арганізацыямі.

24 лютага 2018
Мінск

---

*Беларуская нацыянальная платформа Форуму грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства аб'ядноўвае больш за 70 арганізацый грамадзянскай супольнасці Беларусі*